# ДОБРЫ ВЕЧАР

Добрый вечер

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ ГАЗЕТА

1995
ЧЭРВЕНЬ
15
ЧАЦВЕР
№ 87/ 1016
Цана
200 рублёў


## СТАЛІЧНАЯ ХРОНІКА

*ПА ПАВЕДАМЛЕННЯХ КАРЭСПАНДЭНТАЎ «ДВ», АГЕНЦТВАЎ РІД, БЕЛАПАН, БЕЛІНФАРМ*

### В.ШАЛАДОНАЎ НАЗНАЧАНЫ НАМЕСНІКАМ МІНІСТРА

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь намеснікам міністра па справах Садружнасці Незалежных Дзяржаў назначаны Васіль Іванавіч Шаладонаў. Да нядаўняга часу ён з'яўляўся Генеральным пракурорам рэспублікі і ў сувязі з заявай аб адстаўцы вызвалены ад гэтых абавязкаў.

### СЛУЖБА КАНТРОЛЮ ЗАКЛІКАЛА ДА АДКАЗНАСЦІ

Адбылося пасяджэнне калегіі Службы кантролю Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, на якім былі разгледжаны пытанні парушэнняў фінансава-гаспадарчай дзейнасці арэнднага прадпрыемства "Крыніца" і сур'ёзныя недахопы ў цэнавай палітыцы на Мінскім аўтамабільным заводзе.

На калегіі была адзначана наяўнасць сур'ёзных парушэнняў у рабоце кіраўніцтва гэтых прадпрыемстваў, пастаўлена пытанне аб неабходнасці вызвалення адказных асоб ад займаемых пасад.

Матэрыялы праверкі па Мінскаму аўтамабільнаму заводу накіраваны ў Пракуратуру Рэспублікі Беларусь.

Упраўленне грамадска-палітычнай інфармацыі Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

### ЧУТКІ АБ СМЕРЦІ АНТЫКРЫЗІСНАЙ ПРАГРАМЫ ВЕЛЬМІ ПЕРАБОЛЬШАНЫ

Як вядома, 30 чэрвеня завяршаецца тэрмін рэалізацыі Антыкрызіснай праграмы, падпісанай Прэзідэнтам Беларусі, членамі ўрада і шэрагам спецыялістаў.

"Тры пункты Антыкрызіснай праграмы рэалізаваны поўнасцю. У тым ліку і па інфляцыі, — заявіў карэспандэнту Белінфарма Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. — Чуткі аб тым, што яна правалена, — сказаў ён, — не маюць пад сабой ніякіх падстаў".

Лукашэнка адзначыў, што эканамічная сітуацыя ў рэспубліцы яшчэ складаная. "Але з 50-працэнтнай інфляцыі ў студзені Беларусь за чатыры месяцы падышла да 3-працэнтнай. Я думаю, ні адна дзяржава такім вынікам пахваліцца не можа", — сказаў Прэзідэнт. Ён таксама падкрэсліў, што ў рэспубліцы доўгі час курс долара застаецца нязменным. На яго думку, калі б рэспубліка пайшла так званым рынычным шляхам, долар мог знізіцца ў пяць разоў.

Новую праграму сярэднетэрміновых эканамічных пераўтварэнняў, паведаміў кіраўнік дзяржавы, будзе распрацоўваць Кабінет Міністраў пад кіраўніцтвам віцэ-прэм'ера Міхаіла Мясніковіча.

Ларыса КЛЮЧНІКАВА.

### ПАРА І ЎЛАДУ ПРЫМЯНІЦЬ

У апошні час у Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь паступае шмат скаргаў на дрэнную работу абменных пунктаў валюты. Яны адкрыты не поўны аперацыйны дзень, часта наогул адмаўляюцца прымаць валюту, не прадаюць яе дробнымі купюрамі.

Намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Валянцін Заяш накіраваў ва ўсе свае галоўныя ўпраўленні тэлеграму. У ёй дадзена даручэнне ўстанавіць самы строгі кантроль за захаваннем правілаў куплі і продажу валюты. Абменныя пункты, у якіх будуць выяўлены парушэнні, закрыюцца, Нацыянальны банк адкліча ліцэнзіі на ажыццяўленне абменных аперацый.

Аляксандр ВАЛАВОЙ.

### КАБ САБРАЛІСЯ БАТАЎЦЫ

Сустрэчу ветэранаў 65-й арміі, якія жывуць цяпер у гарадах і вёсках нашай рэспублікі, арганізавалі студэнты Беларускай дзяржаўнай політэхнічнай акадэміі — юнакі і дзяўчаты з пошукавага патрыятычнага аб'яднання.

Больш як 25 гадоў у аб'яднанні вывучаюць баявыя дзеянні арміі пад камандаваннем Героя Савецкага Саюза Паўла Батава, якая адыграла вялікую ролю ў беларускай вызваленчай аперацыі "Баграціён". Старыя салдаты агледзелі экспазіцыю музея акадэміі, дзе скрупулёзна збіраюць экспанаты і дакументы аб іх баявых справах, наведалі Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

У канцы чэрвеня пошукавае патрыятычнае аб'яднанне політэхнічнай акадэміі плануе правесці навукова-гістарычную канферэнцыю, у ходзе якой можна даведацца аб унікальных падрабязнасцях гераічных дзеянняў арміі генерала Батава.

Леанід ТРАЦЭЎСКІ.

### АМЕРЫКАНСКІ ПАЛКОЎНІК РАІЦЦА

У адпаведнасці з міжнароднай праграмай "Ваенныя — ваенным", у Мінск прыбыў і пачаў абмеркаванні з прадстаўнікамі Міністэрства абароны Беларусі кіраўнік праграмы ваенных кантактаў Штаба еўрапейскага камандавання ўзброеных сіл ЗША палкоўнік Лі Элоўэй.

Згода на яго візіт была дадзена ў ходзе праведзенай раней сустрэчы прадстаўнікоў групы садзейнічання ўзброеных сіл Злучаных Штатаў Амерыкі з намочнікам міністра абароны Беларусі па пытаннях ваеннай палітыкі генерал-маёрам Юрыем Партновым.

### ПРЫВАТЫЗАЦЫЯ ФАКТЫЧНА ПРЫПЫНЕНА

У маі ў Мінску не прыватызаваны ніводны аб'ект рэспубліканскай або камунальнай уласнасці.

Як растлумачыў старшыня Мінскага гарадскога камітэта па кіраванні дзяржаўнай маёмасцю і прыватызацыі Тадэвуш Маліноўскі, фактычнае прыпыненне працэсу прыватызацыі звязана з неабходнасцю ўдасканальвання яе нарматыўнай-метадычнай базы. Дагэтуль у стадыі ўзгаднення знаходзяцца пераліки аб'ектаў рэспубліканскай і камунальнай маёмасці, якія намячаюцца да раздзяржаўлення і прыватызацыі ў гэтым годзе. Чакаецца, што пасля канчатковага ўзгаднення гэтых пералікаў працэс рэфарміравання дзяржаўнай уласнасці ў рэспубліцы будзе аднаўлены. На сёння ў Мінску рэфармавана 125 аб'ектаў рэспубліканскай і 197 аб'ектаў камунальнай уласнасці (у тым ліку ў 1995 годзе, адпаведна — 10 і 13). Калі ў мінулым годзе асноўным спосабам прыватызацыі камунальнай уласнасці быў выкуп арэндаванай маёмасці (88 са 119 аб'ектаў), то у бягучым пакуль пераважае продаж па конкурсе (8 з 13). Як правіла, прыватызаваліся, у асноўным, прадпрыемствы гандлю і грамадскага харчавання.

Ірына САЗАНОВІЧ.

### КУРС ОБМЕНА наличной валюты в коммерческих банках на 15 июня 1995 г.

| Наименование банка | Доллар США |  | Немецкая марка |  | Российский рубль |  |
|---|---|---|---|---|---|---|
|  | покупка | продажа | покупка | продажа | покупка | продажа |
| БЕЛАРУСБАНК | 11400* | 11650* | 8000* | 8400* | 1.8* | 2.5* |
| БЕЛБИЗНЕСБАНК (гл. оп. упр.) | информация на 9.50 не получена |  |  |  |  |  |
| ТЕХНОБАНК | 11300 | 11640 | 7800 | 8150 | 2.25 | 2.35 |
| НАРОДНЫЙ БАНК | 11400* | 11650 | 8000* | 8300 | 2.25 | 2.36 |
| ПРИОРБАНК | 11400 | 11650 | 8100 | 8350 | 2.3 | 2.5 |
| СБЕРБАНК | 11350 | 11650 | 7700 | 8100 | 1.8 | 2.4 |
| ОЛИМП | 11300* | 11600* | 7924* | 8384* | 2.23* | 2.36* |
| Ф-л МИЛАВИЦА АКБ ДУКАТ | 11350* | 11750 | 7800 | 8300 | 2 | 2.4 |
| МАГНАТБАНК, ф-л 001 | 11400* | 11700* | 7800* | 8100* | 2.2 | 2.4* |
| "ИНТЕК" | 11500 | 11900 | 7900 | 8300 | 2.2 | 2.4 |
| ДУКАТ | 11400* | 11700* | 7800* | 8200* | 2.2* | 2.7** |
| МинскКОМПЛЕКСБАНК | 11400 11490** | 11750 11800** | 7980 8043** | 8300 8350** | 2.32 | 2.45 |
| "ИНТЕРКОНТИНЕНТАЛЬ-СКВ" | 11450 11300** | 11600 | 7900 | 8400 | 2.1 | 2.5 |
| Ф-л НЕМИГА АКБ ДУКАТ | 11400* | 11700 | 7800* | 8100 | 2.10* | 2.45 |
| Филиал №1 АКБ ОЛИМП | 11450* | 11650* | 7900* | 8150* | 2.2 | 2.4 |
| БЕЛВНЕШЭКОНОМБАНК | 11400* | 11620 | 8160* | 8310 | 2.2 | 2.5 |
| БЕЛИНВЕСТБАНК | 11450 | 11700 | 7800 | 8400 | 2 | 2.4 |

* Возможна операция за наличный и безналичный расчет

** Операция проводится только по безналичному расчету

В течение дня курсы могут меняться, курсы головного управления банков могут несущественно отличаться от курсов, установленных в обменных пунктах.

Информация (на 9 час. 45 мин.) подготовлена "Агентством Гревцова".

| НАЦИОНАЛЬНЫЙ БАНК (официальный курс для б\н расчетов) | 11500 | 8228.98 | 2.36 |
|---|---|---|---|

### КОРОТКО

Столичной прокуратурой возбуждено шесть уголовных дел против фирм, занимающихся инвестиционно-финансовой деятельностью. А в целом, под надзором правоохранительных органов находится около 20 подобных организаций.

На пресс-конференции в Мингорисполкоме прокурор Минска Николай Куприянов сообщил, что, к примеру, сегодня прокуратура имеет существенные претензии к деятельности I Инвестиционного фонда.

***

20-23 июня Министерство культуры и печати Республики Беларусь проводит на базе Академии управления при Кабинете Министров Беларуси семинар для редакторов областных, объединенных и районных газет.

Около 140 редакторов со всей страны получат возможность встретиться с ведущими специалистами министерств и ведомств, представителями Администрации президента, творческой интеллигенцией, познакомиться с работой существующих общественных объединений. Кроме того, запланировано проведение "круглого стола" по теме "Проблемы культуры и СМИ".

ДЗЯРЖАЎНЫ АЛІМП

## ГУЛЬНЯ АМБІЦЫЙ ПРАЦЯГВАЕЦЦА?

### Ва ўсялякім разе мінулая нечарговая сесія Вярхоўнага Савета не дала адказаў на такія балючыя для грамадства пытанні

Людміла КЛАСКОЎСКАЯ, «ДВ».

**Як вядома, зноў сабраць «старых» дэпутатаў у Авальнай зале запатрабаваў нябачны крызіс улады на Беларусі: ранейшы парламент вычарпаў тэрмін сваіх паўнамоцтваў, а новага, па сутнасці, няма. Пасіўнасць выбаршчыкаў прывяла да таго, што мандаты атрымалі толькі 119 новых абраннікаў — намнога менш за тыя 2/3, якія б зрабілі новы парламент легітымным.**

Адразу можна сказаць, што сесія не здолела рассекчы той гордзіеў вузел супярэчнасці, які мы атрымалі па выніках мінулых выбараў.

Па вялікім рахунку працягвалася ўсё ж тая гульня амбіцый...

Трэба адзначыць, што дэпутаты «старога» склікання сабраліся даволі дружна — 264 чалавекі. Прамова Мечыслава Грыба была, у асноўным, скіравана на тое, каб, так бы мовіць, рэабілітаваць стары парламент. Ён пералічыў ягоныя сапраўды несумненныя заслугі — абвяшчэнне незалежнасці Беларусі, замацаванне ў Канстытуцыі яе імкнення да суверэнітэту, шэраг важных законаў...

Вядома ж, на фоне той абвальнай і часам несправядлівай крытыкі, якая гучала апошнім часам у адрас Вярхоўнага Савета, гэтае жаданне М.І.Грыба паказаць мінулую дзейнасць парламента трохі ў лепшым свеце, выглядала натуральна. Але ж 17-я сесія збіралася не дзеля таго, каб яшчэ раз, кажучы словамі славутага Дэйла Карнэгі, «пілаваць апілкі».

Урэшце, аддаў належнае «пілаванню апілак» і Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка. Ён абверг усе абвінавачванні ў свой адрас, зазначыўшы, што ніякім чынам не перашкаджаў арганізацыі і правядзенню выбарчай кампаніі. Прэзідэнт заклікаў дэпутатаў не шукаць віноўных, а найперш больш крытычна ставіцца да сябе. Разам з тым, у яго даволі рэзкай прамове прагучала і канструктыўная прапанова: каб канчаткова сябе не дыскрэдытаваць, каб не марнаваць народныя грошы, стары парламент павінен канчаткова сысці з арэны, але перад гэтым «легалізаваць» новы Вярхоўны Савет, знізіўшы квоту яго дзеяздольнасці з 2/3 да 2/5. Прэзідэнт прысароміў тых дэпутатаў, якія лічацца працуючымі ў парламенце на пастаяннай аснове і апошнім часам атрымліваюць грошы літаральна ні за што.

«Ради Бога, больше уже не собирайтесь, не идите в кассу и не получайте зарплату, мужики!» — усклікнуў ён.

Дыскусія была гарачай. Так, дэпутат Станіслаў Шушкевіч даказна даводзіў, што цяперашняя норма ўдзелу ў выбарах — нерэальная для сапраўды дэмакратычных краін і што па прыкладу заходніх дзяржаў трэба намнога знізіць альбо ўвогуле скасаваць адпаведную планку. «У Францыі, — прывёў прыклад Шушкевіч, — у рэшце рэшт прэзідэнта выбралі 20 працэнтаў грамадзян. Таму трэба мяняць тое, што мы дрэнна зрабілі. А зрабілі дрэнна мы новы выбарчы закон».

Прыкладна тыя ж аргументы прыводзіў і дэпутат Станкевіч, іншыя парламентарыі.

Але гэтыя довады так і павіслі ў паветры — змяненні ў закон аб выбарах не прыняты. Сесія вырашыла толькі, што ўвосень, а менавіта ў канцы лістапада, павінны адбыцца новыя выбары ў Вярхоўны Савет. Адпаведны дзень вырашана аб'явіць непрацоўным.

Што ж, куранят, як кажуць, сапраўды, па восені лічаць. Але ж новавыбраныя дэпутаты ўжо сёння хочуць выглядаць не «куранятамі», а арламі, што яны прадэманстравалі на прайшоўшай у той жа дзень сустрэчы з Прэзідэнтам. У гэтых людзей, якія прайшлі праз сіта перадвыбарнай барацьбы, натуральна таксама ёсць свае амбіцыі. Ды і Прэзідэнт заявіў адназначна: «Я буду надалей працаваць толькі з новым парламентам!»

Карацей кажучы, сесія завяршылася, па сутнасці, так і не даўшы адказы на самыя балючыя пытанні дня. Што нас чакае наперадзе? Бесперспектыўныя туры выбараў, якія, мякка кажучы, наўрад ці дадуць жаданыя вынікі? Валявое рашэнне Прэзідэнта, якое зробіць легітымным новы парламент без згоды «старых» дэпутатаў? Ці, як прадракае апазіцыя, наступленне дыктатуры?

Ва ўсялякім разе, пасля той гульні амбіцый, якая адбылася ўчора ў Авальнай зале, спакайней на душы не стала...

СТАТЫСТЫКА

## "УТАЙМАВАНЫЯ" ЦЭНЫ

У Беларускае Інфармацыйнае агенцтва паступіла паведамленне з Міністэрства статыстыкі і аналізу, у якім, у прыватнасці, адзначаецца, што індэкс спажывецкіх цэн у маі склаў 103,4 працэнта, у тым ліку на харчовыя тавары — 102,8, нехарчовыя — 105,9, паслугі — 103,1 працэнта.

І ў першы тыдзень чэрвеня істотных змяненняў цэн не адбылося.

У сярэднім па рэспубліцы прадукты харчавання падаражэлі на 1,2 працэнта, нехарчовыя тавары і паслугі — на 0,6 працэнта. З 30 мая па 6 чэрвеня захоўвалася тэндэнцыя росту цэн на муку — 2,0 працэнта і, адпаведна, на мучныя вырабы, а таксама на некаторыя віды малочных прадуктаў. На 14 працэнтаў падаражэла гарэлка. Але ў той жа час масла стала таннейшым на 5,9, алей — на 3,2 працэнта. Паступова пачынае таннець агародніна.

А вось тым, хто любіць наведваць кінатэатры ў вячэрні час, за білеты прыходзіцца плаціць больш на 44,7 працэнта.

Аляксандр ВАЛАВОЙ, Белінфарм.



К СВЕДЕНИЮ ПАССАЖИРОВ

**В связи с необходимостью капитального ремонта трамвайного пути по ул.Козлова от ул.Платонова до ул.Михайлова движение трамвайных маршрутов в период с 2.00 19.06.95г. до 4.00 24.07.95г. будет организовано:**

**№ 3 от ДС «Серебрянка» до трамвайного депо и от ДС «Озеро» до пл.З.Бядули.**

**№ 6 от ДС «Серебрянка» до трамвайного депо и от ДС «Зеленый Луг» до пл.З.Бядули.**

**№ 9 от ДС «Серебрянка» до трамвайного депо.**

**№ 11 от ДС «Тракторный завод» до трамвайного депо.**

**Автобусные маршруты с 2.00 19.06.95г. до 4.00 23.06.95г.**

**№ 2 по П.Бровки и ул.Ботанической в обоих направлениях.**

**№ 37 по пр-ту Скорины и ул.Захарова в обоих направлениях с 4.00 23.06.95г. по 24.07.95г.**

**№ 19 объездным путем по ул.Платонова, Чапаева, З.Бядули в обоих направлениях.**

ПО «Минскгорэлектротранс».

ДЫПЛАМАТЫЯ

## РАШАЮЧАЯ РОЛЯ БЕЛАРУСІ

Міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір Сянько атрымаў ліст Дзяржсакратара ЗША Уорэна Крыстофера, у якім выказана ўдзячнасць ураду нашай рэспублікі за падтрымку бестэрміновага прадаўжэння Дагавора аб нераспаўсюджванні ядзернай зброі (ДНЯЗ) на канферэнцыі, што праходзіла ў Нью-Йорку. У лісце адзначаецца, што на канферэнцыі Беларусь мела асаблівы статус і аўтарытэт, бо «з усіх новых незалежных дзяржаў, якія маюць на сваёй тэрыторыі ядзерную зброю, менавіта Беларусь першай далучылася да Дагавора аб нераспаўсюджванні ядзернай зброі ў якасці бяз'ядзернай дзяржавы». Дзяржсакратар ЗША падкрэсліў, што «рашучая падтрымка» з боку Беларусі «дапамагла забяспечыць аналагічную падтрымку» іншых краін.

Андрэй СЕРАДА.

ДАТЫ

## ЕСТЬ ТАКОЙ ДЕНЬ

15 июня — день возрождения предпринимательства в Беларуси. Это не день предпринимателей. Но четыре года назад, когда в Беларуси образовались деловые союзы и приступили к активной деятельности, этот день стал датой, к которой можно было приурочить выставки, подвести некоторые итоги. С просьбой прокомментировать положение в предпринимательском секторе корреспондент обратился к президенту Белорусского союза предпринимателей Владимиру Карягину. Важным, на его взгляд, является то, что сегодня в негосударственном секторе экономики созданы сотни тысяч рабочих мест. Районные бюджеты крупных промышленных городов более чем на 50% состоят уже из доходов от негосударственной сферы экономики. В бюджете Минска их часть составляет более 30%. Это при том, что частные структуры имеют только 5-7% собственности. Значит, сказал В.Карягин, там она используется более эффективно, а затраты на производство — меньше.

15 июня пройдет расширенное заседание совета Белорусского союза предпринимателей с участием международных финансовых институтов, представителей дипломатического корпуса стран, оказывающих наибольшее содействие в проводимых программах. Как всегда, в этот день будут вручены гарантийные сертификаты Белорусского союза предпринимателей, подтверждающие самую высокую надежность фирмы, отмеченной таким образом. Выдано их за все время только 14 и попасть в число "самых достойных" непросто.

Владимир ЛЕБЕДЕВ, РИД.

СУПРАЦОЎНІЦТВА

## НА КАРЫСЦЬ ГРАМАДЗЯНСКАЙ АВІЯЦЫІ

У штаб-кватэры Садружнасці Незалежных Дзяржаў у Мінску завяршыла сваю работу група экспертаў краін — удзельніц СНД, якая займалася разглядам пытанняў арганізацыі супрацоўніцтва ў галіне развіцця грамадзянскай авіяцыі. Вынікам двухдзённых пасяджэнняў стала Пагадненне аб мадэрнізацыі нацыянальнай грамадзянскай авіяцыі дзяржаў Садружнасці праз укараненне на авіяцыйны рынак сучасных транспартных самалётаў. Падрыхтаванае Пагадненне будзе разглядацца на пасяджэнні Міждзяржаўнага эканамічнага камітэта і перададзена на зацвярджэнне кіраўнікам урадаў. Экспертамі таксама падрыхтаваны Мемарандум аб прынцыпах узаемадзеяння і супрацоўніцтва ў галіне грамадзянскай авіяцыі і прыняты зварот да кіраўнікоў дзяржаў і урадаў краін СНД аб актуальнасці дадзенай праблемы і неабходнасці прыцягнення да яе асаблівай увагі.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ, БелаПАН.

«ГОРЯЧИЙ» РЕПОРТАЖ

## ВЕНДЕТТА ПО-БЕЛОРУССКИ?

Александр ЗОТОВ, "ДВ".

Об этом писать действительно тяжело. Особенно со слов очевидцев, невольно оказавшихся в районе автомобильной стоянки по ул. Куйбышева (около универсама "Рига"). Хронологически выстроить цепочку событий все-таки попробую...

Вчера, приблизительно в 9.20 утра, с автостоянки выехал автомобиль марки "Форд-Таурус", принадлежащий директору минского МП "Агропромсервис" С., а спустя несколько минут в машине раздался мощнейший взрыв. Водитель успел резко сбросить скорость, и иномарка еще метров восемьдесят пропетляла по автостраде, полыхая и оставляя за собой горящую дорожку из вытекающего бензина. Напротив общежития БПИ "Форд", наехав на бордюр, резко остановился. С порывом ветра огонь разбушевался еще сильнее, поэтому того, что происходило в салоне, никто практически и не видел. На мгновение показалась рука водителя... Помочь человеку так никто и не смог.

Вызванная "пожарка" прибыла через десять минут. Обгоревшее тело шофера, личность которого устанавливается, в срочном порядке увезла специальная машина.

Собравшийся народ терялся в догадках, а один из мужчин напрямую спросил: "Это убийство?" Что можно было ему ответить? Скорее всего, предположительно с правой стороны автомобиля — между днищем и бензобаком — было заложено взрывное устройство, и взрыв, судя по всему, был направлен в сторону водителя. Тем более, что крышу "Форда" моментально пробило осколками...

Выводы делайте сами, а о будущих подробностях происшедшего мы постараемся рассказать в ближайших номерах газеты.

Фото Юрия ЗАХАРОВА, "ДВ".

ФОТОРЕПОРТАЖ

***

*В Минске открылась международная специализированная выставка «БЕЛАГРО-95». Ее участниками являются многие известные фирмы Белоруссии, Австрии, Венгрии, Германии, США, Италии, Польши, России, Украины, Чехии.*

*В первый день работы выставки ее посетили Президент Республики Беларусь Александр Лукашенко и председатель Кабинета Министров Республики Михаил Чигирь.*

Фото Владимира МЕЖЕВИЧА.

МНЕНИЕ

# СКОЛЬКО ДОЛЖЕН СТОИТЬ ЧЕК?

Александр АНТОНЕНКО.

Было время, когда у нас не было частной собственности: все заводы, фабрики, другие предприятия и организации, а также земля принадлежали всему обществу — народу республики. За счет прибыли этих предприятий материальные блага получали не одни чиновники, возглавляющие эти предприятия, а и народ имел право на гарантированные Конституцией бесплатное образование, медицинское обслуживание, получение бесплатного жилья и хорошую пенсию. Все это способствовало быстрому развитию общества и экономики. Достаточно вспомнить, что по производству продукции сельского хозяйства, производимой на душу населения, республика превзошла США, и если с учетом продукции ВПК и капитального строительства рассчитать показатели промышленного производства, то и они не будут уступать лучшим мировым достижениям.

Производительные силы настолько обогнали закостеневшие производственные отношения, что грянула «криминальная» революция. Казнокрады, чиновники, управленцы, бюрократы и начальники всех рангов, сговорившись, фактически присвоили заводы, фабрики, землю, интеллектуальную собственность республики и даже вклады населения в Сберегательном банке. Возникла ситуация подобная той, при которой вор, укравший автомобиль, прячет его в гараже, а показать никому не может и назвать его своим боится. Есть два выхода из такой ситуации: или разобрать машину на запчасти и продать на «диком» рынке, или же купить подложные документы.

По первому пути пошли чиновники небольших предприятий и организаций. Предприятия были разорваны на части и переданы или сданы в «аренду» различным криминальным, коммерческим и мафиозным структурам, присвоившим огромные финансовые ресурсы Национального и Сберегательного банков с помощью преступной инфляции, навязанной трудящимся республики для уничтожения национальной экономики западными конкурентами и их сообщниками в правительственных кругах. Но чиновники и управленцы предприятий, составляющих основу экономики республики, решили все-таки придать грабежу законный вид. Для этих целей и проводится чековая приватизация. Нетрудно посчитать, что если в республике 7,5 млн. человек имеют право на получение приватизационных чеков, в среднем по 50 чеков на человека, вся государственная собственность, подлежащая приватизации, оценена в 375 млн. чеков. В настоящее время «рыночная» стоимость одного чека составляет 700-1000 рублей и, соответственно, всех 367 млн. где-то 247500 млн. рублей, что по курсу 12000 за 1 доллар равно 26 млн. долларов — цена не самого лучшего самолета. Именно за такую сумму казнокрады, скупив у бедствующего и ограбленного населения их приватизационные чеки, рассчитывают получить документы на безраздельное владение народной собственностью, а народ, сделав послушными рабами, поставить на колени. Напрасно надеетесь, господа. Трудящимся не нужна такая приватизация.

Чиновники, присвоившие государственную собственность и ресурсы, должны заплатить людям, создавшим этот потенциал, полную стоимость, иначе это не приватизация, а грабеж собственного народа.

Приватизация может быть проведена и для восстановления прав трудящихся на собственность, которую они создали своим тяжелым трудом. Для чего, на мой взгляд (хотя это и не моя идея, об этом уже много говорилось и публиковалось в прессе), нужно срочно привести стоимость приватизационных чеков, выдаваемых гражданам республики, в соответствие со стоимостью предприятий, подлежащих приватизации. При этом оценка предприятий должна производиться не по остаточной стоимости с учетом амортизации (такого понятия нет нигде в мире), а по реальной рыночной стоимости зданий, оборудования, материалов и т.д. плюс стоимость земли, которую занимает данное предприятие, цена которой в тысячи раз может превышать стоимость этого предприятия. По моим приближенным расчетам при такой справедливой оценке государственной собственности, стоимость одного приватизационного чека составит не менее 10.000.000 рублей. На каждом приватизационном чеке, выдаваемом человеку, должна быть указана эта фактическая цена чека. Ни один нормальный человек не продаст такой чек за 500 рублей. Естественно, что и у мафии нет таких денег, чтобы скупить у населения их приватизационные чеки по реальной стоимости. Тогда народ сам приватизирует свою собственность и через акции предприятий будет иметь возможность контролировать сохранность и эффективность их работы. На собраниях акционеры предприятий, руководствуясь чувством самосохранения, выберут таких руководителей предприятий, которые обеспечат дальнейшее развитие нашей экономики. Грабеж государства будет остановлен, и люди, создавшие его богатства, получат достойную Человека цивилизованную жизнь, а каждый человек будет иметь возможность быть полезным своим близким, своему народу.

ПОЛИТИКА

# СВОЙ ПАРЛАМЕНТ МЫ УЖЕ ИЗБРАЛИ

Александр РАСОЛЬКО.

Как члену избирательной комиссии по Мирошниченковскому избирательному округу № 247 столицы хотелось бы поделиться своими соображениями по поводу перспективы довыборов необходимого количества депутатов в Верховный Совет осенью этого года.

Наверное, не надо быть семи пядей во лбу, чтобы уже сегодня сделать прогноз: по многим округам выборы вновь не состоятся. Это означает, что немалые средства из карманов налогоплательщиков будут потрачены впустую. Поэтому мнение у членов нашей избирательной комиссии (в нее, кстати, входили представители самых различных партий и движений) однозначно: необходимо срочно пересмотреть статью закона о выборах, согласно которой парламент получает полномочия лишь после избрания в него не менее 2/3 от установленной численности. То есть сколько депутатов на сегодня избрано, с таким количеством и должен работать Верховный Совет. Если же у такого парламента окажется недостаточно сил и возможностей для решения стоящих перед ним задач, правительство должно привлечь к работе высшего законодательного органа ученых и специалистов.

При этом справедливо будет предоставить возможность провести перевыборы и по «несостоявшимся» избирательным округам. Но только по инициативе жителей этих округов и только за счет негосударственных средств. Так как очевидно: налогоплательщики, которые исполнили свой гражданский долг и своевременно проголосовали, не должны расплачиваться за тех, кто недисциплинирован или же не желает иметь своего представителя в Верховном Совете.

НАВІНЫ З ЛІТВЫ

# ПАРЛАМЕНТАРЫІ СВЕТУ БУДУЦЬ ЗАЙМАЦЦА ПРАБЛЕМАЙ ЧАЧНІ

У Вільнюсе створана міжнародная група парламентарыяў свету, якая будзе займацца праблемай Чэчні. Гэта група мае намер таксама падтрымліваць сувязі і супрацоўнічаць з арганізацыяй па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе (АБСЕ) і іншымі міжнароднымі інстытутамі, якія наглядаюць за выкананнем міжнародных законаў і палажэнняў.

Дакумент аб стварэнні групы падпісалі члены парламентаў трынаццаці краін: Літвы, Латвіі, Эстоніі, Расіі, Польшчы, Албаніі, Канады, Балгарыі, Венгрыі, Новай Зеландыі, Індыі, Ісландыі і Японіі.

# ЛІТВА — АЎСТРАЛІЯ: ПАРАФІРАВАНЫ ДАГАВОР АБ АБАРОНЕ ІНВЕСТЫЦЫЙ

25-26 мая ў сталіцы Аўстраліі Канберы дэлегацыя Міністэрства замежных спраў Літвы вяла перагаворы з прадстаўнікамі Дэпартамента замежных спраў і гандлю Аўстраліі аб праекце дагавора паміж Літвой і Аўстраліяй аб заахвочванні і абароне інвестыцый. Тэкст гэтага дагавора быў поўнасцю ўзгоднены і парафіраваны, паведаміў ЭЛЬТА аддзел друку і інфармацыі МЗС Літвы.

# СУПРАЦОЎНІЦТВА ПАЛІЦЫІ: АГУЛЬНЫ ІНФАРМАЦЫЙНЫ БАНК

У бягучым годзе будзе створаны агульны інфармацыйны камп'ютэрны банк паліцэйскіх службаў некалькіх краін. Данымі банка змогуць карыстацца паліцэйскія Польшчы, Літвы, Латвіі, Эстоніі, Расіі, Беларусі і Малдовы. Такое рашэнне прынята на міжнароднай канферэнцыі паліцый гэтых краін, якая прайшла ў Польшчы. Прадугледжваецца, што больш цеснае супрацоўніцтва праваахоўных інстытутаў дапаможа больш паспяхова весці барацьбу з міжнароднымі злачыннымі групоўкамі. Напрыклад, дзякуючы кантактам паліцэйскіх Украіны, Латвіі, Польшчы, Германіі, Расіі і Беларусі, былі затрыманы чатыры тоны паперы для друкавання фальшывых расійскіх рублёў. Друкарня дзейнічала ў Польшчы, а фальшывыя грошы «рэалізоўвала» злачынная група з Гродна.

Адным з важнейшых пытанняў, якія абмяркоўваліся на канферэнцыі, было пытанне барацьбы з арганізаванай і эканамічнай злачыннасцю. У прыватнасці, у Польшчы завяршаецца расследаванне справы, звязанай з «адмываннем» брудных грошай, у якой замешана і немалая група злачынцаў з Расіі.

Белінфарм.

ПРАМЫСЛОВАСЦЬ

# БНПА НАКІРАВАЛА СВАЕ ПРАПАНОВЫ ПА СТАБІЛІЗАЦЫІ

Прамыслоўцы, у прыватнасці, адзначаюць, што сёння ўрад рэспублікі не ў стане аказаць падтрымку ўсім прадпрыемствам. Таму прапануецца вызначыць прыярытэтныя прадпрыемствы, якія ажыццяўляюць асваенне і вытворчасць канкурэнтаздольнай прадукцыі, што мае ўстойлівы збыт, і забяспечыць ім ільготную крэдытную і падатковую падтрымку. Менавіта гэтыя прадпрыемствы ў далейшым стануць асноўнай крыніцай бюджэтных паступленняў. Што ж да тых, якія пастаянна адчуваюць цяжкасці ў вытворчасці і збыце прадукцыі, то, на думку спецыялістаў, трэба неадкладна пачаць сістэмную работу па іх рэарганізацыі і санацыі, а ў выпадку неабходнасці выкарыстоўваць і механізм банкруцтва. Для вырашэння праблемы з папаўненнем абаротных сродкаў прадпрыемстваў прапануецца ўдасканаліць існуючы механізм даацэнкі асноўных фондаў; часова адмяніць спагнанне пені за пратэрміноўку ўплаты падаткаў у бюджэт; дазволіць продаж, здачу ў арэнду і перадачу фондаў, якія часова не дзейнічаюць, з тым, каб выручку ад рэалізацыі накіраваць на папаўненне абаротных сродкаў без абкладання падаткам. Прамыслоўцы таксама мяркуюць, што трэба неадкладна прыступіць да распрацоўкі новага падатковага заканадаўства з мэтай яго аптымізацыі і зніжэння падатковага прэса на суб'екты гаспадарання, стварыць неабходныя ўмовы (гаранты) для прыцягнення айчынных і замежных інвестараў і гэтак далей. Акрамя таго, БНПА прапануе таксама стварыць пры Прэзідэнце і Кабінеце Міністраў грамадскія эканамічныя прававыя саветы для абавязковай папярэдняй прапрацоўкі праектаў заканадаўчых і нарматыўных дакументаў.

Ірына САЗАНОВІЧ, БелаПАН.

# ПА ПРАЕКТУ СУСВЕТНАГА БАНКА

Усяго за некалькі дзён міністэрствы эканомікі, фінансаў, знешніх эканамічных сувязяў, прамысловасці і іншыя ведамствы павінны разгледзець і ўнесці свае прапановы ў Кабінет міністраў рэспублікі па праекту рэфарміравання транспартнага сектара эканомікі і дарожнага будаўніцтва. Праект падрыхтаваны спецыялістамі Сусветнага банка і пасля ўнясення некаторых паправак будзе прыняты ў канчатковым варыянце. Праект складаецца з прапаноў заходніх спецыялістаў па больш эфектыўнаму выкарыстанню транспартнага патэнцыялу, які маецца ў Беларусі, фарміраванню тарыфнай палітыкі (транзітны падатак, дарожныя зборы, тарыфы), прыцягненню замежных інвестыцый у транспартны сектар і дарожнае будаўніцтва. Праект прадугледжвае аказанне дапамогі Сусветнага банка ў выглядзе інвестыцыйных праектаў па такіх накірунках, як структурная перабудова эканомікі, развіццё сістэм тэлекамунікацый, стварэнне транспартнатэрмінальных комплексаў, свабоднай эканамічнай зоны ў раёне Брэста, каардынацыі намаганняў у галіне транспартнай палітыкі з Еўрапейскім Саюзам.

Святлана ЮЗІК, БелаПАН.

ПЕРЕКРЕСТОК

# НА ДОРОГАХ ЭКОНОМИТЬ — СЕБЕ ДОРОЖЕ

Анатолий МАТЮШКО, старший инженер по организации дорожного движения ГАИ, майор милиции.

Состояние городских дорог — давняя проблема, а в последнее время она еще более обострилась. При слякотных переменчивых зимах в начале весны проезжая часть многих улиц зияет выбоинами. И зачастую настолько большими и глубокими, что двигаться на транспорте в этих местах даже опасно. Вот и нынешней весной ситуация мало чем отличалась от предыдущих. В чем же все-таки дело?

Одна из главных причин — чисто климатическая. В условиях мокрой, неустойчивой зимы вода попадает в малейшие щели и трещины дорожного покрытия, а затем, замерзая, расширяется и разрушает его. Сначала появляются небольшие раковины, а затем этот процесс прогрессирует очень быстро. Однако замечу, что чаще всего это бывает в местах, где не совсем качественно проведен в прошедшем сезоне ямочный ремонт: не обработаны компрессором края выбоин и не удален песок, не промазаны их края битумом для лучшего сцепления с ремонтным асфальтобетоном, не использовались в полной мере вибраторы для качественного уплотнения дорожных «заплаток», проводили ремонт в мокрую погоду и др. Таким образом, сказывается и недобросовестное проведение ремонтных работ, несоблюдение их технологии. И, наконец, еще один важный фактор — отсутствие в нужный момент материальных и финансовых средств для проведения ремонта.

В этом году асфальтобетонный завод зимой не работал, он начал выдавать продукцию только с конца марта, да и то, вспомним, весна была холодная, с морозами, снегом и дождями. Делать ремонт горячим асфальтобетоном в такую погоду — равнозначно выбросить деньги на ветер, причем по нынешним временам — немалые. Холодный же асфальтобетон не дает нужного эффекта, очень быстро разрушается. Сдерживает и существующая система оплаты за асфальтобетон. В Минске она такая: районные исполкомы выделяют целевым назначением определенную сумму дорожно-эксплуатационным участкам (ДЭУ). А те получают асфальт только после предварительной оплаты за него производителю. К тому же деньги в исполкомах появляются не всегда своевременно и не всегда в нужном количестве. Вот и приходится властям «идти на поклон» к предприятиям, организациям с просьбой перечислить средства в размере суточной выработки, реализованной продукции и т.п., чтобы поддержать скудный бюджет, внести хоть какую-то лепту в улучшение дорожных условий для самих же себя. Как известно, благотворительность — это удел богатых. Но у нас богатых предприятий пока что не густо.

Между тем и я, и другие специалисты не раз выступали в средствах массовой информации, предлагали возможные пути решения этих проблем. Но все предложения соответствующие должностные лица просто проигнорировали, в том числе и это — о практической реализации Закона Республики Беларусь «О дорожных фондах». А ведь в указанный фонд (республиканский и местные в каждой области) практически все предприятия, небюджетные организации, негосударственные структуры перечисляют (во всяком случае — обязаны перечислять) ежемесячно немалые средства. Это 1% от реализованной продукции (услуг, работ), налоги на регистрируемый в ГАИ транспорт, на топливо, транзитный налог, обязательные отчисления пользователей автодорог и некоторые другие платежи. Но загвоздка как раз в том, что ни этим Законом, ни какими-либо другими руководящими документами не определено справедливое распределение средств фонда. Ранее основными фондодержателями были Миндорстрой и Облдорстрой. Таким образом, поступающие средства дорожного фонда аккумулировались на их расчетных счетах. Но в процессе реорганизации Министерство строительства и эксплуатации автодорог ликвидировано, а ясности в данном вопросе не прибавилось. К примеру, понятно, что городские улицы — это тоже разновидность дорог. Но узаконенного поступления денег из дорожного фонда на их содержание и ремонт пока нет. И это несправедливо, потому что львиная доля отчислений идет от предприятий, организаций, граждан городов, и в особенности — Минска. Почему же минчане не могут рассчитывать на то, что их кровные денежки пойдут не только на загородные дороги, но и на обеспечение безопасного состояния улиц, где они живут и работают? Кому же выгодна такая «мутная вода», и кто в ней «ловит рыбку»? Кто-то же должен за это ответить!

Минск является координационным центром СНГ, и его статус просто обязывает содержать улицы на соответствующем уровне.

Ознакомлю читателей с состоянием ремонта проезжей части улиц во Фрунзенском районе. Здесь временно (до окончания строительства метро) заделаны большие выбоины и просадки на улице Кальварийской, закончена укладка слоя асфальтобетона по всей ее ширине. Для этого было перекрыто движение всех видов транспорта (поэтапно), в том числе и маршрутного. Это, безусловно, сказалось на движении по другим маршрутам: на улице Тимирязева, проспекте Пушкина возникали задержки транспорта и аварийные ситуации. Госавтоинспекции порой даже приходилось вручную регулировать движение. Ликвидированы ямы на участке проспекта Пушкина от улицы Матусевича до площади Притыцкого (включительно) и других. Ремонтные и другие работы продолжаются. В этом году планируется капитально отремонтировать улицу Грибоедова, участки проспекта Пушкина, улиц Жудро, Притыцкого, целого ряда других. Хотелось бы, чтобы все участники дорожного движения с пониманием и ответственностью отнеслись ко всем изменениям в организации дорожного движения, которые неизбежны при выполнении указанных мероприятий. О конкретных сроках проведения работ с закрытием или значительным ограничением движения на определенных улицах должны заблаговременно информировать граждан ремонтно-строительные организации (заказчики).

Со стороны же Госавтоинспекции в организации дорожного движения оказывалось и будет оказываться впредь необходимое содействие.

УМЕЕМ ЛИ МЫ ЭКОНОМИТЬ?

# ЕСЛИ ХОТИТЕ УЗНАТЬ, БОГАТЫ ЛИ МЫ — ЗАГЛЯНИТЕ НА СВАЛКУ

Александр ДИСКО.

Во дворе дома № 18 по проспекту Рокоссовского у первого подъезда много месяцев валялся сгоревший электромотор, у второго — разбитая ванна, у третьего — тоже какие-то старые детали.

Такую картину можно увидеть сегодня повсеместно. Город, впрочем, как и вся страна, завален металлоломом, и никого это не тревожит, хотя металлурги жалуются на нехватку такого сырья. Но «Вторчермет» не внемлет, занимаясь по традиции преимущественно бумаготворчеством.

Много внимания одно время было сосредоточено на макулатуре. Сбор ее шел довольно успешно, потому что в основу был положен принцип материальной заинтересованности — меняли на хорошие книги. Школьники даже соревновались — кто соберет больше. Но и эта работа постепенно прекратилась, хотя нужда в бумаге острейшая, в т.ч. в связи с «размножением» прессы, откликнувшейся на гласность.

Оглянитесь вокруг — миллионы рублей гибнут из-за нашей безалаберности, бесхозяйственности. Сбор всех видов вторичного сырья — бумаги, тряпья, стекла, металлов, в том числе цветных, — идет из рук вон плохо. Фактически его теперь вообще нет. Да и где уж собирать все это, если пропадает даже значительная часть урожая зерна и овощей из-за нерадивости и корыстных интересов самих производителей, которые считают, что лучше пусть пропадет, но цену они не сбавят.

Остряки называют теперь Минск «банановой республикой», потому что он весь завален кожурой заморских плодов. Конечно, проще простого эти так называемые бытовые отходы собирать в кучу и вывозить, выделив для этого транспорт. Но давайте прежде посмотрим состав этого «мусора».

Помимо банановых очисток, значительную часть его составляют предметы, имеющие определенную ценность. Например, всевозможные бутылки иностранного происхождения, которые нигде не принимают.

Сегодня сбором выброшенных бутылок занимаются преимущественно пенсионеры и алкоголики. Но они берут только пивные и водочные, которые можно сдать, а все остальное продолжает валяться, пока не превратится в осколки под колесами автомашин и камнями хулиганов. В мусоре можно увидеть и металлические банки, тоже — из-под разных импортных напитков. Сам собой напрашивается вопрос: почему бы не организовать сбор того и другого и оплачивать этот общественно-полезный труд? Ведь стекло в любом его виде, как и металл, может быть вторично использовано после переплавки. Стоимость этого сырья не так уж мала, а сейчас оно фактически тонет в массе невостребованных отходов.

Вот лишь два поучительных примера. В начале двадцатых годов, когда начиналось восстановление хозяйства, разрушенного гражданской войной, тогдашний командарм военно-морских сил предложил правительству продавать за границу устаревшие корабли. На вырученную валюту приобретались паровозы, тракторы, оборудование для строящихся заводов. И еще пример. Когда после войны в Лыткарине на одной из строек не хватало строительных материалов, один из руководителей стройки сконструировал гвоздодер для извлечения старых гвоздей и их вторичного использования.

Сегодня есть кого привлечь к сбору вторичного сырья. Безработных более чем достаточно. Надо только организовать дело.

Пусть, наконец, займутся полезным делом и те, кто нищенствует и по существу паразитирует на человеческом милосердии. О том, что среди тех, кто собирает милостыню, много вполне трудоспособных людей, писалось уже неоднократно. Минчане должны знать, что сегодня в городе для всех есть работа по способностям и возможностям, и не содержать бездельников своими подачками. Пусть идут собирать утиль и подметать улицы, как это принято во всем цивилизованном мире.

К сбору тех же банок и некондиционных бутылок из-под пива и вина можно привлечь и подростков-школьников, как когда-то к сбору макулатуры. И оплачивать им эту работу. Не все же им зарабатывать на мытье частных машин или продаже на обочине шоссе воды из родника. Тут они растут предприимчивыми дельцами для собственной выгоды, а собирая вторичное сырье, будут проникаться сознанием своей причастности к интересам государства. Они будут знать, что приносят своей работой пользу не только себе, но и стране, своему народу.

Убежден, что школьники охотно откликнутся на такой призыв, если школа сама проявит инициативу. Кстати, ребят можно привлечь и к сбору аптечной посуды, которая сейчас тоже идет на свалку. А батарейки, применяемые в радиотехнике, игрушках, приборах! Они тоже в конечном счете оказываются на помойке, а ведь в них — цветные металлы, графит, которые могут быть использованы вторично. Во многих странах старые элементы старательно собирают и перерабатывают. Несомненную ценность представляют и лезвия для бритья, изготавливаемые из особой стали. Да мало ли что еще дорого стоит!

